Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ

# ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА Ў ХВАСЦЕ ЛІТАРАТУРНАГА РУХУ

Беларуская савецкая мастацкая літаратура штогод становіцца ідэйна больш насычанай, праблемнай, актуальнай, баявой. Творчасць пісьменнікаў усё больш узбагачваецца мастацкімі сродкамі, удасканальваецца культура тэхнікі мастацкага вобраза, значна пашыраюцца межы тэматыкі. Мастацкая літаратура, знаходзячыся на ўздыме свайго развіцця, становіцца больш дзейным, больш вострым сродкам нашай партыі ў барацьбе за пабудову бяскласавага грамадства.

Плённы рост нашай літаратуры бясспрэчны. Аднак, з усёй выразнасцю, без непатрэбнага захаплення поспехамі, мы павінны падкрэсліць, што мастацкая літаратура яшчэ адстае ад гіганцкіх працэсаў сацыялістычнага будаўніцтва. Задача аргкамітэта ССП і ўсёй пісьменніцкай масы паскорыць працэс сваёй перабудовы, актывізаваць сваю творчую работу і як мага хутчэй ліквідаваць адставанне, актыўна ўключыцца ў перадавыя рады ўдарнікаў-будаўнікоў новага, светлага, разумнага жыцця.

Зусім дрэнная справа, глыбокі і зацяжны прарыў на ўчастку літаратурнай крытыкі. За апошні год было столькі крытычных работ, што іх можна пералічыць на пальцах адной рукі. Участак крытычнай работы мае асабліва вялікае значэнне на даным этапе барацьбы і развіцця нашай літаратуры. Марксісцкая літаратурная крытыка абавязана разграміць літаратуразнаўчыя "тэорыі" беларускай контррэвалюцыі і яе "мастацкія практыкаванні", аба-

Першыя крокі заклiку герояў рабочага класа ў лiтаратуру далі плённыя вынікі.

Вырашаць задачы, што стаяць перад пралетарскай лiтаратурай, вызначыць шляхі для заваявання гегемонii пралетарскай літаратуры ў найкарацейшыя гістарычныя тэрміны на канферэнцыі Мінскай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменнікаў будуць сёння і новыя сілы - аўтары рабочыя-ўдарнікі, заклікаяыя ў літаратуру.

Гэта новае ў гісторыі пралетарскага літаратурнага руху з"яўляецца вялікай перамогай камуністычнай партыі, кіраўніка барацьбы за вялікае мастацтва бальшавізму. Падкрэсліваючы значны рост, безумоўны поспех пралетарскай літаратуры, мы абавязаны выразна падкрэсліць факт адставання літаратуры ад разгорнутых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Не аслабляць класавай барацьбы на літаратурным фронце, выяўляць і знішчаць праяўленні велікадзяржаўнага шавінізму, носьбітаў нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі, накіроўваць агонь на два фронты - на правых і "левых", узбройвацца ленінізмам, узняць творчую актыўнасць, дзейна ўключыцца ў рады будаўнікоў сацыялізму - вось шлях ліквідацыі адставання літаратуры.

Вялікай задачай МенАПП"у з"яўляецца выхаваўчая работа сярод папутнікаў пралетарскай літаратуры: дапамагчы ім стаць на шлях саюзніка, аўладаць ленінскім метадам - метадам марксіцкай дыялектыкі.

Выключна важнай задачай МенАПП"а і ўсяго пралетарскага літаратурнага руху БССР з"яўляецца разгортванне самакрытыкі. Ідэйна аздараўляючы свае рады, стварыць умовы творчага росту рабочых-ударнікаў у літаратуры, наладзіўшы сістэматычнае вы-

У сваёй літаратурнай дзейнасці (дарэчы сказаць, нізкапробнай якасці) Жылуновіч выступаў з варожай тэорыяй, быццам ў дарэвалюцыйнай Беларусі не было класаў. Гэтыя-ж контррэвалюцыйныя "тэорыі" паслядоўна працягваў у літаратуры, замаскаваўшыся туманам буржуазнай рамантыкі, нацдэм Зарэцкі. Рад яго твораў - гэта выразная праграма дзеяння нацыянал-фашызма. Па іх сцежках ішоў ядавітай кулацкай гадзінай Баранавых, юрадзівы, культура якога была на ўзроўні культуры дарэвалюцыйнага канавала.

Пад кіраўніцтвам нашай партыі савецкая грамадскасць не раз выкрывала іх контррэвалюцыйную сутнасць. Яны, хаваючы ў халяве нож, адточаны майстрамі фашызма, крывілі душой, двурушнічалі, быццам-бы прызнавалі свае памылкі, прасілі даць магчымасць іх выправіць сваёй работай. Напісалі па два-тры падхалімскія халтурныя апавяданні, "прызналі", бачце, савецкую ўладу, і змоўклі.

Матывіроўкай свайго"маўчання" яны высоўвалі тэзіс складанасці "творчай перабудовы". Па сутнасці "маўчанне" было формай маскіроўкі ворага, які не разброіўся, бо само "маўчанне" было "не-маўчаннем" - яны пісалі, але рукапісы сваіх "твораў" хавалі ў сундукі, чакаючы... зручнага моманту.

Ворагі народу насаджалі бытавы распад, п"янства, багему, як сродак разлажэння радоў савецкіх пісьменнікаў. Ад багемы да фашызма - адзін крок. Аб гэтым сведчаць факты. Вольны, Хадыка, Кляшторны і інш. - гэта гнусныя тыпы, атручаныя чадам алкаголя, - не раз падбіраліся, як падаль, з рыштоў і

Мы лічым неабходным, каб нашы газеты арганізоўвалі ўвагу пралетарскай грамадскасці вакол задач пралетарскай літаратуры, узялі пад свой кантроль працу па падрыхтоўцы да канферэнцыі, правялі праверку кіраўніцтва заводскімі парткалектывамі літаратурнымі гурткамі, прынялі актыўны ўдзел у працы канферэнцыі.

Мы просім Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі выдаць да канферэнцыі творы пралетарскіх пісьменнікаў, зборнікі якіх знаходзяцца ў друку.

Зусім у баку стаяць ад падрыхтоўкі да канферэнцыі нашы навуковыя і навучальныя ўстановы. Мы лічым, што Акадэмія Навук можа і павінна вылучыць брыгаду марксістаў для ўключэння ў секцыю крытыкі МенАПП"у. Даўно пара знішчыць разрыў паміж даследчыкамі-літаратуразнаўцамі і практыкай пралетарскага літаратурнага руху. Дзейна павінны рыхтавацца да канферэнцыі нашы навучальныя ўстановы і, у першую чаргу, тыя, дзе рыхтуюцца выкладчыкі літаратуры і мастацтва. Пытанням сумежных з літаратурай ведамстваў на канферэнцыі будзе аддана вялікая ўвага, а гэта значыць, што працаўнікі тэатру, выяўленчага мастацтва, кіно, музыкі павінны прыйсці на канферэнцыю падрыхтаванымі, каб узброенымі ўключыцца ў паход за вялікае мастацтва бальшавізму.

Справа літаратуры - справа рабочага класа. На канферэнцыі рабочыя Мінска павінны прад"явіць рахунак пралетарскай літаратуры, якая пры ўсіх сваіх заваяваннях адстае яшчэ ад разгорнутых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, і вылучыць з

Няўжо ўся іх шкодніцкая дзейнасць выкрыта і разгромлена? Безумоўна, не!

Абсалютна бяздзейнічае секцыя крытыкаў, а крытыкі павінны быць у авангардзе барацьбы за ідэйную чыстату савецкай літаратуры, быць застрэльшчыкамі павышэння рэвалюцыйнай пільнасці.

Зусім ухіляюцца ад удзелу ў рэвалюцыйным руху работнікі інстытута літаратуры, мовы і мастацтва Акадэміі навук БССР, напэўна лічачы, што жывая сувязь з пісьменніцкімі масамі - лішняя рэч.

Ёсць яшчэ і такія"літаратары", якія нічога агульнага з літаратурай не маюць.

Пара нам перагледзець склад членаў і кандыдатаў саюза і многіх вызваліць ад лішняй нагрузкі - звання савецкага пісьменніка. Пара нам колкім венікам разагнаць і каля-літаратурную публіку, якая толькі шкодзіць у справе стварэння здаровай творчай атмасферы.

Заўтра адбудзецца агульны сход пісьменнікаў па пытанню аб становішчы ССП і аб творчых задачах да 20-й гадавіны Вялікай пралетарскай рэвалюцыі.

Сход павінен прайсці пад знакам разгорнутай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Да канца выкарчаваць корні ворагаў на літаратурным фронце сарваць з іх маскі двурушніцтва, паказаць іх агідную душу гандляроў беларускім народам - важнейшая палітычная задача. Ажыццяўляючы гэту задачу, кожны пісьменнік будзе ўзбройвацца для новай плённай творчай работы.

Толькі крытыка і самакрытыка дапамо-
заваць работу ССП па-новаму, канчаткова даб"е
шчыны, забяспечыць ідэйны і творчы рост, уздым р-
пільнасць савецкага пісьменніка.

Сход павінен быць рашаючым у справе перабудовы р
саюза па-новаму. Трэба зрабіць Саюз пісьменнікаў сапраўднай
грамадскай арганізацыяй, кожны член якой павінен мець свае
правы і абавязкі. Саюз савецкіх пісьменнікаў БССР павінен усю
сваю работу будаваць выходзячы з Сталінскай Канстытуцыі. Толь-
кі гэты шлях забяспечыць далейшы ўздым палітычнай і творчай
актыўнасці пісьменніцкіх мас, і 20-ую гадавіну Кастрычніка
пісьменнікі спаткаюць новымі выдатнымі творамі, поўнымі страс-
най любві да нашай сацыялістычнай радзімы, да роднай камуні-
стычнай партыі, і поўнымі велізарнай сілы нянавісці да заклятых
ворагаў савецкага народу.

"Звязда",1937,24-Ш,№ 69(5743)с.3.